НАЦИОНАЛЬНАЯ АКАДЕМИЯ НАУК БЕЛАРУСИ
Институт истории

# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ ИСТОРИИ И КУЛЬТУРЫ

СБОРНИК НАУЧНЫХ СТАТЕЙ

*Основан в 2018 году*

Выпуск 1

# Европа: актуальные проблемы этнокультуры

Минск
«Беларуская навука»
2018

# СОДЕРЖАНИЕ

**Предисловие** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Раздел 1. **Этнокультурные трансформации в истории Европы**

*Тугай У. В.* Склавены Іардана: да пытання этнічнай ідэнтыфікацыі . . 5

*Григорьев В. В.* Позднеантичная Европа и гуннское воздействие . . 13

*Шадыра В. І.* Крывічы, палачане і латгалы: агульнае і адметнае ў этнічнай гісторыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17

*Дзярновіч А. І.* «Остзейскае пытанне»: палеміка паміж расійскай і нямецкай публіцыстыкамі адносна гістарычнага лёсу балтыйскіх правінцый у другой палове XIX ст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29

*Григорьев В. В.* Распад гуннского кочевого государства и его последствия для европейской истории . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38

*Циватый В. Г.* Теория и практика деятельности европейских дипломатов в период раннего Нового времени (XVI–XVIII вв.): этнокультурный, институциональный и внешнеполитический аспекты . . . . . . . . . . 43

*Лявіцкі Я. В.* Роля Крымскага ханства падчас памежнай вайны Вялікага Княства Літоўскага і Вялікага Княства Маскоўскага ў 1487–1494 гг. 53

*Кваченок В. В.* Евреи средневековой Испании в российской историографии в XIX – начале XXI в. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60

*Мазарчук Д. В.* Фиск и военный флот в государственном строительстве на территории Италии в период раннего Нового времени . . . . . . . . 64

*Лугвин С. Б.* Английское чиновничество как альтернативный вариант европейской бюрократии . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70

*Ландина Л. В.* Концепт европейского абсолютизма: проблемное поле современной историографии . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76

*Глеб М. В.* Либералы и империя в истории Великобритании XIX – начала XX в. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82

*Шевелев Д. Л.* Британцы, арабы и евреи в период Первой мировой войны: миф о предательстве в прочтении критика . . . . . . . . . . . . . . . . . 88

*Либони Д. А.* Этнографические заметки русских чиновников о бессарабских румынах и поляках (40–50-е годы XIX в.): сравнительный обзор . . . 93

*Кузьма Д. І.* Прадстаўленні М. В. Каяловіча аб этнічных межах у заходніх губернях Расійскай імперыі . . . 98

*Андрияка А. А.* Очерк истории становления земского самоуправления в Юго-Западном крае Российской империи в 1904–1911 гг. . . . 104

*Тугай В. В., Кубеко С. П.* Образ немца в народной традиции белорусов и литовцев . . . 111

*Кваченок В. В.* Христианская церковь средневековой Испании в российской историографии XX – начала XXI вв. . . . 117

*Галиева Ф. Г.* Белорусы Башкирии: история и культура вдали от родины . . . 121

*Шлапеко Е. А.* Северный регионализм в приграничных регионах России: значение культуры . . . 125

*Дьяконова М. В.* Сохранение культуры малых коренных народов как фактор развития сельских территорий (на примере Республики Карелия) . . . 130

*Шлапеко Е. А., Степанова С. В.* Влияние миграции на развитие приграничных территорий: этнокультурные аспекты . . . 136

*Каргинова В. В.* Трансформация восприятия рисков финно-угорскими народами: роль языка . . . 140

*Крывашэй Д. А.* Культурная палітыка ў эпоху інфармацыйнага грамадства . . . 146

*Коваль Ж. Э.* Повышение качества американского высшего образования в рамках программы «Равные возможности для всех детей» . . . 153

*Денисевич А. А.* Профессиональная подготовка студентов-историков в Даремском университете . . . 158

*Диденко Е. В.* КНР и сирийский кризис . . . 165

Раздел 2. **История и культура Беларуси**

*Чикалова И. Р.* Белорусская национально-культурная идентичность в оптике фронтирных исследований . . . 171

*Касович А. В., Лютый А. М.* Историография проблемы зарождения государственности на территории Беларуси . . . 176

*Лабанок А. К., Лютый А. М.* Крыніцы росту насельніцтва гарадоў і мястэчак Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст. . . . 182

*Лютая А. Э.* Историография истории ремесла в Беларуси во второй половине XVIII – первой половине XIX в. . . . 191

*Трестьян И. Н.* Институт гражданского губернаторства на территории Беларуси (1796–1801 гг.)....................................... 199

*Восович С. М.* Культурно-просветительская деятельность Могилевского Богоявленского братства в 1883–1914 гг...................... 202

*Талмачова С. А.* Стварэнне і дзейнасць павятовых па чыншавых справах прысутнасцей у Беларусі (1886–1914 гг.)................... 208

*Подорожняя Е. А.* Проект особого совещания о передаче дел из центральных в местные учреждения (1903 г.) и его реализация в Беларуси 214

*Гулюк М. А.* Першая расійская рэвалюцыя 1905–1907 гг. і змены ва ўрадавай палітыцы ў галіне пачатковай адукацыі на Беларусі і Літве 220

*Щавлинский Н. Б.* Нарочская наступательная операция русских войск в марте 1916 г. и причины ее неудач......................... 226

*Трубчык А. Г.* Дзейнасць галоўнай апякунскай рады на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў час польска-савецкай вайны (1919–1921 гг.) ..... 232

*Бароўская В. М.* Рыжская місія М. С. Касакоўскага (ліпень – жнівень 1920 г.)................................................... 238

*Пурышева Н. Н.* Дифференциация литературных объединений как форма адаптации к условиям общественно-политической жизни БССР в 1920-е гг. ............................................... 245

*Кунцэвіч В. М.* Музычнае мастацтва Савецкай Беларусі: гісторыка-метадалагічны аспект (1918–1932 гг.) ............................ 250

*Даніловіч В. В.* Сістэма палітычнай асветы моладзі Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг. ............................................ 257

*Кузюкович А. П.* Государственная политика Советской Беларуси по развитию физической культуры и спорта в 1920–1930-е гг.......... 268

*Кривуть В. И.* «Конкурсы хорошего чтения» на территории Западной Беларуси в 1930-е гг. ........................................ 272

*Крыварот А. А.* Узаемадзеянне савецкіх партызанскіх фарміраванняў Беларусі і Латвіі ў 1942–1943 гг. ................................ 277

*Пашик С. М., Багдасарян А. Н.* Политика Третьего рейха в Беларуси: «благие» цели и белорусская реальность......................... 285

*Катюшкина А. А.* Восстановление мелиоративного хозяйства БССР и его деятельность в первые послевоенные годы (1945–1947 гг.) ....... 291

*Нестерович Н. Б.* Послевоенная коллективизация сельского хозяйства в Западнобелорусском регионе как политико-идеологическая кампания 296

*Нестерович Н. Б.* «Свинский» поезд (из истории иностранного туризма в БССР времен хрущевской «оттепели») ..................... 303

*Смяховіч М. У.* Аграрная палітыка ў СССР і БССР: перыяды, асаблівасці (восень 1943–1991 гг.)................................ 308

*Мазец В. Г.* Беларуская чыгунка ва ўмовах эканамічнага эксперымента і гаспадарчага разліку (1985–1991 гг.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 314

*Крывічаніна К. А.* Чарнобыльская катастрофа і суверэнізацыя Беларусі ў час распаду СССР. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 320

*Александрович Е. А.* Экономическое сотрудничество Беларуси и Казахстана в 1991–2016 гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 327

*Тугай В. В., Поповская Т. А.* Еврорегионы в системе трансграничного сотрудничества Республики Беларусь. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 335

*Поповская Т. А.* Отношения Республики Беларусь со странами АСЕАН: Вьетнам. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 343

*Иоффе Э. Г.* Национальная политика Республики Беларусь в 1991–2000 гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 352

*Христенко О. А.* Деятельность воскресных школ Белорусской православной церкви (1990-е– начало 2000-х гг.). . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 359

*Соловьянов А. П.* Помощь зарубежных организаций детским интернатным учреждениям Беларуси (1991–2005 гг.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 365

*Гросс Е. П.* Основные формы международного сотрудничества общественных объединений Республики Беларусь в 1990–2010-е гг. . . . 370

**Краткие сведения об авторах** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 381

**А. І. Дзярновіч**

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, г. Мінск*

# «ОСТЗЕЙСКАЕ ПЫТАННЕ»: ПАЛЕМІКА ПАМІЖ РАСІЙСКАЙ І НЯМЕЦКАЙ ПУБЛІЦЫСТЫКАМІ АДНОСНА ГІСТАРЫЧНАГА ЛЁСУ БАЛТЫЙСКІХ ПРАВІНЦЫЙ У другой палове XIX ст.

Грамадскія дыскусіі ў Остзейскіх губернях, ажыўленне якіх прыпала на сярэдзіну XIX ст., неслі на сабе адбітак папярэдніх стагоддзяў гісторыі краю, прынамсі, апошніх васьмі стагоддзяў. Каб ахарактарызаваць «Остзейскае пытанне» другой паловы XIX – пачатку XX ст., найперш акрэслім некаторыя важныя для тэмы паняцці і дэфініцыі.

*Остзейскімі губернямі*, ці *Остзейскім краем*, у Расійскай імперыі пазначалі тэрыторыі Курляндскай, Ліфляндскай і Эстляндскай губерняў. Першыя тры чвэрці XIX ст., апроч таго, існавала і рэгіянальнае аб'яднанне гэтых губерняў у рамках генерал-губернатарства з цэнтрам у Рызе (1801–1878). Але і пасля скасавання гэтай адміністратыўнай структуры агульнасць лёсу Остзейскіх губерняў захоўвалася, што і выяўлялася ў назвах Остзейскі, ці Прыбалтыйскі, край. Такім чынам, Остзейскія губерні аб'ядноўвалі практычна ўсе эстонскія і латышскія тэрыторыі, за выключэннем Латгаліі – паўднёва-ўсходніх паветаў Латвіі, якія ўваходзілі ў Віцебскую губерню (1802–1917 гг.). Сама ж назва «Остзейскія губерні» паходзіць ад нямецкай назвы Балтыйскага мора – «Ostsee».

Пад «Остзейскім пытаннем» у той час разумелі ўнутрыпалітычную праблему Расійскай імперыі, якая ўключала ў сябе ўзаемаадносіны цэнтральнай імперскай улады і галоўных суб'ектаў палітыка-прававога рэгулявання ў Остзейскіх губернях, найперш прывілеяванай нямецкай меншасці, а таксама карэнных жыхароў краю (латышоў і эстонцаў) і расійскіх пасяленцаў. Такім чынам, «Остзейскае пытанне» – гэта праблема пераразмеркавання палі-

pawet.net

тычных правоў і, адпаведна, рэалізацыя магчымасцей на ўплыў жыцця краю.

**Остзейскія губерні: права і дэмаграфія.** У складзе Расійскай імперыі Остзейскія губерні валодалі асаблівым статусам. У аснове кіравання імі ляжала мясцовае заканадаўства («Збор мясцовых узаконенняў губерняў остзейскіх»), паводле якога ўнутранае кіраванне краем ажыццяўлялася органамі самакіравання дваранства разам з урадавымі ўстановамі. Хоць сфера кампетэнцыі апошніх з канца XVIII ст. пашыралася, але ж да пачатку Першай сусветнай вайны губернатар як прадстаўнік цэнтральнай улады быў вымушаны выбудоўваць сваю службовую дзейнасць такім чынам, каб не парушаць прывілеяў остзейскага дваранства [2, p. 73].

*«Збор мясцовых узаконенняў губерняў остзейскіх»* уяўляў сабой трохтомную кадыфікацыю крыніц права, якія дзейнічалі ў губернях Прыбалтыйскага краю. Часткі Збору дзяліліся на кнігі, кнігі – на раздзелы, раздзелы на главы, главы на аддзелы, аддзелы на артыкулы. Першыя дзве часткі былі выдадзены ў 1845 г. У першай частцы былі выкладзены ўстановы прысутных месцаў Прыбалтыйскіх губерняў. Артыкулы гэтай часткі з увядзеннем у 1889 г. у Прыбалтыйскіх губернях Судовых статутаў страцілі ў большасці выпадкаў сваю сілу. Адступленні ад агульнага губернскага кіравання, дапушчаныя для Прыбалтыйскага краю (напрыклад, пастановы аб мытнай паліцыі), змешчаныя ў II томе «Збору законаў» выдання 1892 г. Другая частка была прысвечана пастановам аб станах (акрамя сельскіх абывацеляў). Да першых дзвюх частак Збору ў 1853 г. быў выдадзены працяг. Трэцяя частка (кадыфікаваная прафесарам Дэрпцкага ўніверсітэта фон Бунге), была прысвечана грамадзянскаму праву і выйшла ў 1864 г. Частка гэтых палажэнняў дзейнічала толькі на пэўных тэрыторыях. У Курземе і Відземе адпаведныя палажэнні гэтай часткі, з некаторымі зменамі (найперш у галіне законаў аб шлюбе), захоўвалі сілу да ўступлення ў сілу новага Грамадзянскага закона Латвійскай рэспублікі ў 1938 г.

Пытанне аб суадносінах агульнаімперскага і мясцовага заканадаўства ў Остзейскіх губернях актыўна абмяркоўвалася юрыс-

тамі Расіі ў 1830–1890-я гг. Мясцовыя (остзейскія) правазнаўцы, якія прадстаўлялі школу выбітнага прадстаўніка прыбалтыйска-нямецкай юрыдычнай школы Фёдара (Фрыдрых-Георг) фон Бунге (1802–1897), настойвалі на тым, што ў краі маглі мець сілу толькі законы, спецыяльна для яго выдадзеныя, а з агульнарасійскіх – толькі тыя, распаўсюджванне якіх на Прыбалтыку асабліва агаворвалася. Школа Бунге дапускала прымяненне агульнаімперскага заканадаўства толькі пры ўмове адпаведнасці гэтых нормаў асновам мясцовага правапарадку і толькі тады, калі ў остзейскім праве меўся прабел.

Апанентам школы Бунге выступіў у канцы 1890-х гг. П. І. Бяляеў. На яго думку, у краі дзейнічала агульнаімперскае права, а остзейскія законы ён разглядаў як частку расійскага заканадаўства. Дадзеная канцэпцыя апраўдвала ўмяшанне ўрада ў сацыяльныя і эканамічныя адносіны ў Прыбалтыцы [3, с. 137–138].

У другой палове XIX – пачатку XX ст. Прыбалтыйскі край зведаў глыбокія змены ў сацыяльнай і нацыянальнай структурах. Адной з галоўных прычын гэтага быў інтэнсіўны рост капіталістычных адносін у краі і, адпаведна, урбанізацыйныя працэсы – колькасць жыхароў буйных гарадоў губерняў за кошт выхадцаў з вёскі няўхільна павялічвалася. Так, з 1867 па 1897 г. колькасць латышоў у Рызе вырасла з 23,5 да 41,64 %, а эстонцаў у Рэвелі – з 51,8 да 88,7 % [10, s. 80]. Напярэдадні Першай сусветнай вайны ў сувязі з мілітарызацыяй эканомікі ўрбанізацыйныя працэсы толькі ўзмацніліся.

Але працэсы перасялення былых сялян у гарады зусім не азначалі ліквідацыі аграрнай праблемы на вёсцы. Інтэнсіўнае развіццё капіталістычных, рыначных адносін адбывалася там таксама, што абвастрала праблему сялянскага малазямелля. На мяжы XIX–XX стст. у Эстляндскай губерні 73,9 % зямлі належала памешчыкам, сялянскія надзелы складалі 23,7 %, дзяржаўныя – 2,4 % зямельнага фонду. У Ліфляндскай губерні прапорцыі размеркавання зямлі выглядалі наступным чынам: 54,3 %, 34,8 %, 10,9 % [6, с. 351]. І тут варта нагадаць, што памешчыкамі ў Остзейскім краі практычна цалкам былі немцы – нашчадкі ўладароў даўняй Лівоніі. А ў пачатку XX ст. карэннае насельніцтва краю (латышы і эстон-

цы) складалі агулам каля 85 % колькасці жыхароў, немцы – 6 %, расіяне – 5 %.

Такім чынам, на зыходзе XIX і пачатку XX ст. Остзейскія губерні, перажываючы перыяд актыўнай мадэрнізацыі, усё яшчэ вельмі выразна адрозніваліся ад іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі паводле свайго гістарычнага лёсу, культуры, саслоўнага ладу, форм землеўладання і грамадзянскіх законаў.

**Славянафілы: фармуляванне праблемы.** Сама праблематыка «Остзейскага пытання» была сфармуляваная прадстаўнікамі расійскай кансерватыўнай думкі – у колах, блізкіх да славянафілаў.

Упершыню «Остзейскае пытанне» было ўзнята вядомым славянафілам Юрыем Самарыным (1819–1876) яшчэ ў 1848 г. Працуючы на працягу двух гадоў у Рызе ў складзе рэвізійнай камісіі, прызначанай Міністэрствам унутраных спраў з мэтай разгляду гарадскога ладу і гаспадаркі прыбалтыйскіх гарадоў для прывядзення іх да агульнарасійскага прававога ладу, Самарын ўшчыльную сутыкнуўся са спецыфікай остзейскага ўладкавання. Пра свае рыжскія ўражанні Ю. Ф. Самарын так пісаў у лісце да М. П. Пагодзіна ад 9 кастрычніка 1847 г.: «Я магу сказаць, усё тут дыхае нянавісцю да нас, нянавісцю слабога да моцнага, таго, каго падтрымалі, да дабрадзея і разам з тым ганарлівай пагардай настаўніка, які выжыў з розуму, да перарослага яго вучня. Тут усё асяроддзе такое, што штохвілінна ўсвядоміш сябе рускім і, як рускі, абражаешся» [7, с. 51]. Вынікам разважанняў Ю. Самарына сталі «Лісты з Рыгі» [8], якія, фактычна, былі вострапалемічнымі памфлетамі. Іх аўтар, пасля апісання ўсеўладдзя ў краі нямецкіх баронаў і адсутнасці чаго-небудзь падобнага на прысутнасць расійскай дзяржаўнай улады, прыйшоў да трохі парадаксальнай высновы: «Мне здаецца, Расія далучана да Остзейскага краю і паступова заваёўваецца остзейцамі» [8, с. 12].

Спецыфіка ідэалагічнага супрацьстаяння расійскіх славянафілаў з остзейскімі элітамі палягала ў тым, што нямецкія роды Прыбалтыкі былі вернымі і кваліфікаванымі функцыянерамі царскай адміністратыўнай сістэмы. Мясцовае прыбалтыйскае дваранства адкрыта заяўляла, што яны прымалі прысягу на вернасць імператару, а не Расійскай дзяржаве. Вядомы остзейскі публіцыст

Г. Беркгольц зусім адкрыта пісаў у 1860 г.: «Прыбалтыйскія немцы маюць усе падставы быць ўсёй душой за дынастыю, бо толькі абсалютная ўлада цара аберагае іх. Між тым любая руская партыя, дэмакратычная, бюракратычная ці якая-небудзь іншая, зжарэ іх, ледзь толькі яна даб'ецца вырашальнай перавагі» [9, с. 58].

Разумеючы такую сістэму ўзаемаадносін остзейскага баронства і царызму, зусім не трэба здзіўляцца, што за свае «Лісты з Рыгі» Ю. Самарын быў арыштаваны і змешчаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць. У канцы 1849 г. адбылася знамянальная гутарка Мікалая I і Самарына. Паводле расійскага цара, кніга Самарына падрывала давер да ўрада, абвінавачваючы яго ў тым, што ён здраджвае нацыянальным інтарэсам рускага народа. Абараняючы остзейцаў, Мікалай I сказаў так: «Вы дакараеце цэлыя саслоўі, якія служылі верна; пачынаючы з Паўла, мог бы налічыць да 150 генералаў; хочаце прымусам, сілай зрабіць з немцаў рускіх, з мячом у руках, як Магамет іх і г. д., г. зн. калі немцы не зробяцца рускімі, рускія зробяцца немцамі; ... Рускія не могуць зрабіцца немцамі, але мы павінны любоўю і лагоднасцю прыцягнуць да сябе немцаў» [7, с. 55–56]. Хоць Самарын быў выпушчаны з-за кратаў, остзейскае пытанне ў той перыяд абмяркоўваць было забаронена.

Толькі ўжо пры Александры II праблема нацыянальна-саслоўных кампетэнцый у Остзейскім краі выйшла на арэну публічнага абмеркавання. І тут расійскія славянафілы атрымалі, даволі нечакана на першы погляд, саюзнікаў у абліччы новапаўсталай інтэлігенцыі карэнных народаў Прыбалтыйскага краю.

Супрацоўнік рускага кансерватыўнага журналіста і рэдактара М. Н. Каткова латыш Крыш'яніс Валдэмар змясціў у газеце «Московские ведомости» артыкул пад назвай «Хто кіруе Расіяй: самі рускія ці немцы?» [4, № 161]. У артыкуле былі прыведзены наступныя лічбы: сярод расійскіх міністраў – 15 % немцаў, сярод членаў Дзяржаўнага Савета – 25, сярод сенатараў – 40, генералаў – 80, губернатараў – 60 %. Каткоў, прачытаўшы артыкул перад здачай нумара газеты ў друк, не паверыў у гэтыя лічбы і загадаў свайму сакратару іх пераправерыць. Вынікі праверкі ўразілі Каткова яшчэ больш: сенатараў-немцаў апынулася нават больш – 63 % [5, с. 47–60].

**Палеміка паміж остзейцамі і славянафіламі.** На далейшае разгортванне палемікі па «Остзейскаму пытанню» паўплываў знешнепалітычны фактар – узмацненне Прусіі і аб'яднанне ў 1871 г. Германіі пад яе вяршэнствам. Названыя падзеі выклікалі энтузіязм у заўважнай часткі остзейскіх публіцыстаў, і гэта акалічнасць упершыню за паўтара стагоддзя расійскага валадарства ў краі паставіла пад сумнеў вернасць остзейцаў Расіі.

Нейкія трывожныя знакі для прыхільнікаў адзінай імперыі меліся і раней. Яшчэ ў 1848–1849 гг., падчас рэвалюцыі ў Германіі, тры прыбалтыйскія расійскія губерні былі абвешчаныя так званым Франкфурцкім парламентам (Франкфурцкім нацыянальным сходам) часткай агульнагерманскага Рэйха. У той час рэвалюцыі гэтага сходу не ўспрымаліся сур'ёзна. Але цяпер імкліва падымалася новая сусветная дзяржава ў выглядзе Германскай імперыі, і яе прэтэнзіі на валоданне «даўнім нямецкім краем» ва ўсходняй частцы Балтыйскага мора зараз ужо трэба было прымаць пад увагу. Таму і остзейскі лад расійскія публіцысты сталі ўспрымаць як пагрозу тэрытарыяльнай цэласнасці Расіі.

Але побач з актыўнай публіцыстыкай нямецкія остзейскія эліты спрыялі развіццю і прафесійнай гістарыяграфіі. Пры гэтым асноўнай мэтай остзейскай гістарыяграфіі было давесці апраўданасць саслоўнага ладу Прыбалтыйскага краю і арганічнасць нямецкага значэння тут. У кантэксце гэтых высілкаў асабліваe значэнне набывалі гісторыка-прававыя даследаванні і публікацыі даўніх прававых актаў. Таму высокае развіццё археаграфіі стала адметнай якасцю прыбалтыйска-нямецкай гістарыяграфіі. Нямецкая (остзейская) гістарыяграфія другой паловы XIX – пачатку XX ст. дасягнула пэўных вышыняў. Прынамсі, расійская гістарыяграфія гэтага краю не магла скласці канкурэнцыі працам мясцовых нямецкіх гісторыкаў, якія актыўна карысталіся метадалагічным і крыніцазнаўчым досведам асноўных універсітэцкіх цэнтраў Германіі.

Пэўныя падставы для такіх настрояў давалі і рээмігранты з Остзейскага краю ў Германію. Трохі пазней, на мяжы XIX і XX стст., ідэі еднасці нямецкага свету прапагандавалі ў самой Германіі трое выхадцаў з расійскай Прыбалтыкі – універсітэцкія

прафесары і адначасова папулярныя журналісты Тэадор Шыман (1847–1921), Ёганес Халер (1865–1947) і Пауль Рорбах (1869–1956). Усе трое лічыліся самымі чытанымі з нямецкіх публіцыстаў. Шыман рэдагаваў «Крыжовую газету» («Kreuzzeitung» – так у сапраўднасці называлі «Neue Preussische Zeitung» з-за выявы жалезнага крыжа ў загалоўку газеты), у якой некалі працаваў Бісмарк, а Рорбаха пастаянна чытаў кайзер Вільгельм II. Кіраўніком жа остзейскіх эмігрантаў у Прусіі быў былы намеснік старшыні Ліфляндскага вышэйшага суда фон Бок. Вядомы славянафіл Іван Аксакаў (1823–1886) у сваім артыкуле «По поводу «Окраин» Ю. Ф. Самарина» вельмі негатыўна ацэньваў яго дзейнасць і сцвярджаў, што той «арганізаваў у Берліне цэлую сістэму агітацыі грамадскай думкі супраць Расіі і сваімі пасквілямі, якія перыядычна з'яўляліся, як брандэрамі распальвае прускі нацыянальны патрыятызм» [1, с. 688].

Падобная рэпліка Аксакава была зусім не выпадковай – гэты расійскі публіцыст самым непасрэдным чынам далучыўся да палемікі вакол «Остзейскага пытання». У яго літаратурнай спадчыне больш за два дзясяткі артыкулаў па прыбалтыйскім пытанні. Ужо ў першым «остзейскім» артыкуле, змешчаным 2 чэрвеня 1862 г. пад назвай «Як разумее Остзейскі Немец ідэал Расіі», Аксакаў зазначае, што «ідэал Расіі, які прапаведуюць остзейскія немцы, заснаваны на глыбокім, сур'ёзным і шчырым пачуцці этатызму, пачуцці вернасці і адданасці немцаў дзяржаве, імперыі, але не рускаму народу». Звяртаў увагу І. Аксакаў і на становішча тубыльцаў краю. Не выпадкова адзін з яго артыкулаў у газеце «День» ад 27 лістапада 1865 г. называецца «На якой падставе селянін Остзейскага краю пазбаўлены тых правоў, якімі карыстаецца селянін у астатняй Расіі?»

Публіцыстыка Івана Аксакава таксама цікавая тым, што ў славянафільскім дыскурсе ён сканструяваў паралелі паміж «остзейскім» і «польскім» (у Паўночна-Заходнім краі) пытаннямі. Паводле Аксакава, цяжка не заўважыць аналогію «польскай і нямецкай справы» – падабенства паводзін палякаў у Паўночна-Заходнім краі і немцаў у Остзейскім краі Расійскай імперыі «кідаецца ў вочы». Па-першае, «як у паўночна-заходніх губернях палякі, так і ў Балтыйскім Памор'і немцы – прыхадні і не нале-

жаць да тутэйшай нацыянальнасці краю»; па-другое, «як там, так і тут немцы і палякі – гаспадары ў краі, у якім уяўляюць значную меншасць»; па-трэцяе, менавіта ў іх руках «сканцэнтравана пазямельная ўласнасць, сацыяльныя прывілеі і ўсе сродкі ціску на няпольскія і ненямецкія масы народа»; па-чацвёртае, у іх асяроддзі пануе «імкненне ў Паўночна-Заходнім краі апалячыць рускіх і літоўцаў, а ў Балтыйскіх губернях – анямечыць латышоў і эстаў»; па-пятае, «спосабы пераўвасаблення тубыльнай народнасці ў польскую і нямецкую ўжываюцца амаль аднолькава: рэлігія, школы, спакусы жыццёвых выгод, пагрозы, гвалт, ганенні, прыніжэнні...»; па-шостае, «вышэйшыя класы, складзеныя з людзей чужой нацыянальнасці, г. зн. з палякаў і з немцаў, – засланялі, а ў Балтыйскім Памор'і працягваюць засланяць і цяпер масы сельскага насельніцтва ад вярхоўнай расійскай улады»; і, нарэшце, па-сёмае, «у гэтых масах прыгнечанага сельскага насельніцтва глыбока ўкаранёная нацыянальная варожасць да сваіх гвалтаўнікоў – да польскіх паноў і да нямецкіх рыцараў, жыве шчырая цяга да Расіі, шчырая вера ў Рускага цара...» [1, с. 81]. Аксакаў падкрэслівае словы Самарына аб тым, што той, «хто прапаведуе неабходнасць падцягнуць, утаймаваць і асадзіць расійскае грамадства, скіраваць супраць яго апараты паліцэйскай улады, – той у той жа час заігрывае з польскай шляхтай і моўчкі пасуе пры сустрэчы з балтыйскім рыцарствам» [1, с. 691].

Яшчэ адна важная заканамернасць выяўляецца ў славянафільскім дыскурсе – антысемітызм. Аксакаў напрамую заяўляў, што да ролі гаспадароў, падобна да становішча остзейскага рыцарства і польскай шляхты ў гэтых краях, імкнуліся і яўрэі. Ужо ў першым артыкуле, прысвечаным прыбалтыйскаму пытанню, у 1862 г. Аксакаў фармулюе парадаксальнае для яго «падабенства нямецкага гледжання з яўрэйскім»: «Яўрэі, гэтак жа як і немцы, не прызнаюць у Расіі Рускай народнасці і падвяргаюць яшчэ сумневу пытанне (для немцаў ужо даўно вырашанае адмоўна!) аб тым: ці сапраўды Рускія – гаспадары ў Рускай зямлі? На іх думку, яўрэі ў Рускай зямлі такія ж гаспадары, як і рускія. Такое патрабаванне яўрэяў... цалкам супадае з нямецкім ідэалам адцягненай (абстрагаванай. – *А. Д.*) дзяржавы» [1, с. 8].

Ахоўніцкія тэндэнцыі, імкненне абгрунтаваць нязменнасць улады расійскага царызму вызначаюць тэндэнцыйную скіраванасць публіцыстыкі Аксакава. Да таго ж ён дапускае яўныя гістарычныя памылкі. Як паказваюць працы па генеалогіі і сацыяльнай гісторыі, шляхецкі клас Беларусі і Літвы быў сфарміраваны з мясцовага баярства, а не мігрантаў уласна з Польшчы. Непасрэдным палітычным фонам, на якім нараджаліся падобныя погляды Аксакава, было паўстанне 1863–1864 гг. на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай.

**Высновы.** «Остзейскае пытанне» як праблема ўзаемаадносін мясцовага (латышскага і эстонскага) насельніцтва Остзейскіх губерняў Расійскай імперыі з нямецкім прывілеяваным насельніцтвам (дваранствам і верхнімі слаямі гараджан) і царскай адміністрацыі (рэгіянальнай і цэнтральнай) абвастрыўся пад уплывам паўстання 1863 г. у Беларусі, Літве і Польшчы. У прыбалтыйскіх губернях адбывалася рэалізацыя «Вялікіх рэформаў» і адначасовы рост нацыянальнай самасвядомасці карэнных народаў. Усе гэтыя працэсы выклікалі ажыўленую дыскусію ў публіцыстыцы і гістарыяграфіі рэгіёна. «Ахоўніцкая» стратэгія нямецкай гісторыка-прававой школы не змагла цалкам забяспечыць нязменнасць прывілеяванага становішча нямецкага насельніцтва («остзейскага ладу»). Пры гэтым уласна нямецкая гістарыяграфія Остзейскага краю дасягнула высокага прафесійнага ўзроўню. Латвійская гістарычная публіцыстыка гэтага перыяду мела прарасійскія тэндэнцыі. Расійская жа публіцыстыка і гістарыяграфія не змаглі выпрацаваць адэкватнай мадэлі апісання рэгіёна, які падаваўся непарушна расійскім. У канчатковым выніку паразу пацярпела і расійская палітыка ў гэтым рэгіёне.

## Літаратура


1. Аксаков, И. С. Отчего так нелегко живется в России? / И. С. Аксаков. – М.: РОССПЭН, 2002. – 1008 с.

2. Андреева, Н. С. «Остзейский вопрос» во внутренней политике российского правительства / Н. С. Андреева // Cahiers du Monde russe. – 2002. – 43/1, Janvier-mars 2002. – P. 67–102.

3. Беляев, П. И. Общеимперский закон и местные остзейские узаконения / П. И. Беляев // Журнал министерства юстиции. – 1898. – № 9. – С. 121–167.

4. Валдемар, Х. М. Кто правит Россией: сами русские или немцы? / Х. М. Валдемар // Московские ведомости. – 1869. – Июль. – № 161.

5. Инфантьев, Б. Малоизвестные страницы жизни и деятельности Кришьяна Валдемара / Б. Инфантьев // Русский мир и Латвия: три века русской культуры в Латвии. Памяти Б. Ф. Инфантьева. – Рига: Издание об-ва SEMINARIUM HORTUS HUMANITATIS, 2009. – С. 47–60.

6. История Эстонской ССР. – Таллин: Ээсти Раамат, 1966. – Т. 2. – 793 с.

7. Нольде, Б. Э. Юрий Самарин и его время / Б. Э. Нольде. – Paris: Soc. anonyme Impr. de Navarre, 1926. – 240 с.

8. Самарин Ю. Ф. Сочинения / Ю. Ф. Самарин. – М.: Тип. А. И. Мамонтова и К°, 1889. – Т. VII: Письма из Риги и История Риги. – CXXXV+658 с.

9. Сергеев, С. «Хозяева» против «наемников»: русско-немецкое противостояние в императорской России / С. Сергеев // Вопросы национализма. – 2010. – № 3. – С. 38–78.

10. Taube, A von. Die Deutschbalten – Schicksal und Erbe einer eigenständigen Gemeinschaft / A. Taube, E. Thomson, M. Garleff // Die Deutschbalten / Ed. W. Schlau. – München: Langen Müller, 1995. – S. 51–115.

**В. В. Григорьев**

*Белорусский государственный музей истории Великой Отечественной войны, г. Минск*

## РАСПАД ГУННСКОГО КОЧЕВОГО ГОСУДАРСТВА И ЕГО ПОСЛЕДСТВИЯ ДЛЯ ЕВРОПЕЙСКОЙ ИСТОРИИ

В Великом переселении народов в Европе рубежа Античности и Средневековья одно из важных мест занимает период с середины V и до конца VI в. н. э. За это время Западная Римская империя, истощенная варварским натиском, исчезает с исторической арены, а сам процесс становления и развития варварских королевств закладывает основы дальнейших этнических и политических процессов в Европе. Эти события неразрывно связаны с распадом гуннского кочевого государства в середине V в. н. э. и вызванными им изменениями в этническом и политическом пространстве Европы.

Основными силами в Европе к середине V в. н. э. являлись Византия, слабеющая Западная Римская империя и варварский мир, значимую роль в котором играло кочевое государство